Дольнікаў А

# ЗІНЬКОВІЧ МІТРАФАН ІВАНАВІЧ

Нарадзіўся ў 1900 годзе ў вёсцы Пячары Касцюковіцкага раёна. 18-гадовым юнаком уступіў у рады Чырвонай гвардыі. У баях адстойваў існаванне першай у свеце рабоча-сялянскай дзяржавы. У 1923 годзе закончыў ваенную школу ў горадзе Палтава. У 1930 годзе паступіў у ваенную акадэмію імя Фрунзе, якую ў 1934 годзе паспяхова закончыў. Член КПСС, Зіньковіч да пачатку Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў Мангольскай Народнай Рэспубліцы намеснікам камандзіра вайсковай часці. У пачатку 1942 года па яго просьбе Мітрафана Іванавіча накіравалі на Першы Украінскі фронт – камандзірам 12 гвардзейскага корпуса. Пад яго началам гвардзейцы прымалі ўдзел у Сталінградскай бітве, грамілі фашыстаў на Арлоўска-Курскім і Белгарадскім напрамках, вызвалялі Курск і Белгарад.

**БУКРЫНСКІ ПЯТАЧОК**

22 верасня 1943 года гвардзейцы генерала Зіньковіча выходзяць да Дняпра на поўдзень ад Пераяслаў-Хмяльніцкага і пачынаюць падрыхтоўку і фарсіраванне ракі. Бярвенне і дошкі, пантоны і лодкі, парожнія бочкі ад гаручага — усё было пушчана ў ход. Пад прыкрыццём густога восеньскага тумана пачалася гэта аперацыя.

Першымі на бераг, заняты ворагам, высадзіліся і завязалі бой воіны мотастралковага батальёна адной з брыгад. Нягледзячы на жорсткае супраціўленне немцаў, ім удалося замацавацца на правабярэжжы і стварыць умовы для пераправы падраздзяленням другога эшалона. К вечару савецкія войскі выбілі фашыстаў з невялікай вёскі Грыгор’еўка. Плацдарм расшырыўся. Гэта быў вядомы "Букрынскі пятачок", які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Адсюль Стаўка Вярхоўнага Галоўракамандуючага намячала ажыццяўленне апошняй вялікай аперацыі 1943 года – вызваленне Кіева. Важнасць расшырэння Букрынскага плацдарма разумеў не толькі генерал Зіньковіч, – але і кожны салдат яго корпуса. Разумелі гэта і нямецкія генералы. І пагэтаму, каб ліквідаваць небяспеку, якая навісла над першым крылом арміі, яны кінулі на Букрынскі плацдарм свае ўдарныя мотастралковыя і танкавыя часці.

Дзень і ноч у невялікай звіліне Дняпра не змаўкалі баі. Прыкрываемыя з паветра бамбардыроўшчыкамі і штурмавікамі, ішлі фашысцкія танкі, хвалямі накідвалася пяхота. Праяўляючы выключную мужнасць, генерал Зіньковіч асабіста кіраваў абаронай плацдарма, сваёй адвагай натхняў воінаў, якія адну за другой адбівалі фашысцкія атакі.

24 верасня фашысты распачалі яшчэ адзін масіраваны удар па плацдарму і пераправе. Усё патанула ў разрывах бомб і снарадаў, у скрогаце гусеніц.

– Гвардзейцы, ні кроку назад! – пачулі байцы знаёмы голас свайго генерала. Смерць або перамога! Але нельга адступаць...

Шалёны асколак нямецкай бомбы прасвістаў над акопамі ўдарыў у вісок. Цела Мітрафана Іванавіча паціху спаўзло з бруствера, абсыпалася ўкраінскім чарназёмам. Гэта быў апошні бой генерала Зіньковіча. Ад радавога чырвонагвардзейца вырас ён да генерала, камандзіра 12 гвардзейскага танкавага корпуса. Званне Героя Савецкага Саюза генерал-маёру М. І. Зіньковічу прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 лістапада 1943 года (пасмяротна).

**Дольнікаў, А. Зіньковіч Мітрафан Іванавіч / А. Дольнікаў // Сцяг камунізма (Касцюковічы). — 1971. — 19 кастрычніка. — С. 4.**